**Сарокіна, Т.** [Плешаков Михаил] // Віцебскі рабочы. — 1987. — 12 жн. — С. 4.

## ПЛЕШАКОВ МИХАИЛ

,

Сустрэча воінаў-дэсантнікаў запасу і воінаў, якія выконвалі свой інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане**,** адбылася днямі ў Віцебску. Прыйшлі сюды і ветэраны.

Усё майстэрства**,** якое атрымалі хлопцы за час службы ў дэсантных войсках, прадэманстравалі яны перад удзельнікамі сустрэчы: і трэніровачныя скачкі з вышкі, і паветранае дэсанціраванне з самалёта Ан-2, і валоданне зброяй, прыёмамі барацьбы.

Потым адбыўся мітынг-рэквіем на могілках у Мазурыне, прысвечаны памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія загінулі пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане. Удзельнікі мітынгу выказалі шчырае жаданне, каб адна з вуліц Віцебска насіла імя воінаў-інтэрнацыяналістаў – яны дастойныя таго, каб землякі ўшанавалі іх памяць.

А потым быў канцэрт у гарадскім Доме культуры, гучалі песні часоў Вялікай Айчыннай вайны. Выступалі са сваімі песнямі і вершамі хлопцы, якія вярнуліся пасля службы ў радах абмежаванага кантынгенту савецкіх войск у Афганістане.

Сустрэча, арганізаваная саветам воінаў-інтэрнацыяналістаў пры гаркоме камсамола**,** не пройдзе бясследна: яна расказала моладзі аб подзвігах іх сучаснікаў, прадэманстравала непарыўную сувязь пакаленняў змагароў за шчасце і мір на зямлі.

Свае пасяджэнні савет воінаў-інтэрнацыяналістаў праводзіць у гаркоме камсамола па пятніцах у 19 гадзін.

**Т. Сарокіна**

**На здымках**: Міхаіл Плешакоў, былы воін, выканаў на вечары ў ГДК песні аб Афганістане; сустрэліся былыя воіны (фота А. Таніна)